Источник: **«Звязда» - 2012-05-25**

## Заўсёды разам са сваімі чытачамі

**Учора ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Газета "Звязда" ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі", прымеркаваная да 95-годдзя заснавання выдання і 70-годдзя выхаду першага нумара падпольнай "Звязды" ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**Удзельнікам рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Газета "Звязда" ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі (да 95-годдзя заснавання і 70-годдзя першага падпольнага выхаду "Звязды" ў гады Вялікай Айчыннай вайны)"**

***Паважаныя сябры!***

*Шчыра вітаю вас на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 95-годдзю заснавання газеты "Звязда" і 70-годдзю першага выпуску выдання ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*

*Гісторыя "Звязды" непарыўна звязана з гераічным мінулым нашай краіны. Старонкі газеты — дакладны і праўдзівы летапіс жыцця беларускага народа. Газеце належыць адметная роля ў станаўленні і развіцці беларускіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, фарміраванні высокіх традыцый нацыянальнай журналістыкі, выхаванні цэлай плеяды выдатных прафесіяналаў.*

*"Звязда" з'яўляецца нацыянальна-культурным набыткам беларускага народа. Па яе матэрыялах можна вывучаць гісторыю Беларусі са жніўня 1917 года па сённяшні дзень — і гераічную, і складаную, і часам трагічную.*

*У гады Вялікай Айчыннай вайны "Звязда" выходзіла ў падполлі ў Мінску, пасля — у партызанскай зоне на востраве Зыслаў Любанскага раёна. У гэты цяжкі для краіны час яна мужным друкаваным словам заклікала чытачоў на барацьбу з ворагам.*

*Высокай адзнакай ролі газеты сталі ордэны Айчыннай вайны I ступені і Працоўнага Чырвонага Сцяга.*

*Сёння "Звязда" — адзіная беларускамоўная штодзённая грамадска-палітычная газета ў рэспубліцы. Безумоўным прыярытэтам у працы рэдакцыйнага калектыву з'яўляецца прапаганда нацыянальнай культуры, гістарычнай спадчыны нашага народа.*

*Журналісты "Звязды" заўсёды трымаюць руку на пульсе жыцця краіны. Аб'ектыўнае і ўсебаковае інфармаванне чытачоў пра падзеі на Беларусі і ў замежжы садзейнічае вырашэнню задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, патрыятычнаму і духоўнаму выхаванню грамадзян краіны.*

*Упэўнены, што падчас канферэнцыі адбудзецца зацікаўленае і плённае абмеркаванне актуальных пытанняў гісторыі, сучаснага стану і перспектыў развіцця беларускай журналістыкі, а вынікам стане далейшае павышэнне прафесійнага ўзроўню і грамадскай значнасці айчынных сродкаў масавай інфармацыі.*

*Шчыра жадаю вам пасяховай работы і ўсяго самага найлепшага!*

**Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі.**

* * *

На канферэнцыю было замоўлена звыш 50 дакладаў.

Відаць, супрацоўнікам "Звязды" накавана лёсам адлюстроўваць пераломныя моманты жыцця беларускага народа. Гэтая думка чырвонай ніткай праходзіла літаральна праз усе выступленні ўдзельнікаў канферэнцыі. З самага пачатку заснавання "Звязда" (першыя нумары выходзілі тыражом не больш за 1500 экзэмпляраў) праявіла байцоўскі характар. І

далей у гады цяжкіх выпрабаванняў, асабліва ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі, і ў гады пасляваеннага аднаўлення разбуранай ушчэнт рэспублікі, калектыў рэдакцыі з гонарам нёс звяздоўскі сцяг.

Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя, у прыватнасці, зазначыў, што цяжка знайсці чалавека, які б не ведаў "Звязды". Амаль стагоддзе гучыць яе страснае, палымянае слова. Гісторыя газеты — гэта 95-гадовая гісторыя беларускага народа. "Звязда" — гэта і своеасаблівы летапісец нашай эпохі. І якія выпрабаванні ні выпадалі б на лёс газеты, яна заўсёды разам са сваімі чытачамі, лічыць Аляксандр Аляксандравіч.

**Удзельнікі канферэнцыі: Май Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, унук Герца Данцыга, і Галіна Каржанеўская, дачка мінскага падпольшчыка, распаўсюджвальніка падпольнай "Звязды" Мікалая Каржанеўскага.**




Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Даніловіч параўнаў "Звязду" з настаўніцай жыцця, назваў яе флагманам беларускага друку. Біяграфія газеты цесна звязана з лёсам краіны, напоўненым яркімі незабыўнымі старонкамі, якімі можна і трэба ганарыцца, упэўнены навукоўца.

Пра асобныя, малавядомыя не толькі шырокай публіцы, але нават і спецыялістам, моманты існавання "Звязды" ў вельмі складаны рэвалюцыйны перыяд яе станаўлення (1917—1920 гг.) нагадаў вядомы палітолаг, галоўны рэдактар часопіса "Беларуская думка", кандыдат гістарычных навук, намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін. На думку даследчыка, нумары "Звязды" за гэты час можна разглядаць як важную крыніцу гістарычных дакументаў.

Увогуле словы "гісторыя", "гістарычны" гучалі часта ў час канферэнцыі. Шмат цікавага расказалі і тыя, хто меў дачыненне да сапраўды велічных гістарычных падзей. Аб іх расказалі прысутным Май Вольфавіч Данцыг, народны мастак Беларусі, прафесар, унук Герца Данцыга, у друкарні якога ўбачыў свет першы нумар газеты "Звязда". Галіна Мікалаеўна Каржанеўская, дачка мінскага падпольшчыка Мікалая Каржанеўскага, распаўсюджвальніка падпольнай "Звязды", была таксама сярод удзельнікаў канферэнцыі.

У "Звязды" славутая гісторыя і славутыя традыцыі, якія маюць вельмі нямногія выданні на постсавецкай прасторы. Гэтыя словы належаць намесніку міністра інфармацыі Уладзіміру Матусевічу. Газета стала інтэлектуальным, рэсурсным цэнтрам нацыянальнай культуры, нацыянальнай навукі, гістарычнай спадчыны беларусаў. І сёння газета актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні інфармацыйнага поля Беларусі. Хутка ў рэдакцыі з'явяцца новыя дадатковыя магчымасці: "Звязда" ўзбуйняецца структурна. На яе базе будзе створаны выдавецкі дом "Звязда", у які ўвойдуць не толькі беларускамоўныя грамадска-палітычныя СМІ, але і шэраг мастацка-літаратурных і культуралагічных часопісаў. У гэтай сувязі "Звязда" мае ўсе шанцы стаць крэатыўным цэнтрам нацыянальных і культурных ініцыятыў, карысных для ўсёй краіны і грамадства, паведаміў намеснік міністра інфармацыі.

*Леанід Тугарын*